Галоўны выбар

Сёлетняя прыёмная кампанія рыхтуюцца зрабіць адзін вызначыцца з прафесіяй і ВНУ, З гэтай нагоды ў РВУ "Культура прэс-клуба на тэму "Кім быць?



ПРА ПАДРЫХТОЎКУ ДА ПАСТУПЛЕННЯ

У ВНУ сферы культуры працуюць падрыхтоўчыя аддзяленні альбо курсы — доўгатэрміновыя, на працягу вучэбнага года ці семестра, і кароткатэрміновыя, прыкладна па два тыдні.

— Абітурыентам варта разумець, што на кароткатэрміновых курсах у поўнай меры падрыхтавацца да ўступных іспытаў без папярэдніх заняткаў і матывацыі амаль немагчыма, — звяртае ўвагу **Наталля Карчэўская**, рэктар Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт. — Яны прызначаны хутчэй для таго, каб сістэматызаваць веды, адтачыць уменні. А яшчэ — дапамагчы абітурыенту адаптавацца ў незнаёмым асяроддзі, паспрабаваць на слых, навобмацак сцэну, адчуць акустыку; урэшце, звыкнуцца з аўдыторыямі.

Па меркаванні Наталлі Уладзіміраўны — і яе падтрымалі калегі, — часцей за ўсё менавіта падчас такіх заняткаў маладыя людзі прыходзяць да ўпэўненасці ў тым, наколькі правільны зрабілі выбар. Бывае, што пасля падрыхтоўчых курсаў выпускнік не становіцца абітурыентам.

— І гэта не так страшна, — лічыць **Іван Паўлаў**, дэкан факультэта кіно, тэатра і тэлебачання Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў, рэжысёр, сцэнарыст. — Найбольш важна, каб юнак ці дзяўчына вызначыліся яшчэ на этапе ўступнай кампаніі і пазней вучыліся і працавалі з задавальненнем.

— Зразумела, што лепш прайсці доўгатэрміновыя курсы, — лічыць **Андрэй Аніська**, старшы выкладчык, адказны сакратар прыёмнай камісіі Акадэміі мастацтваў. — Яны даюць шырэйшае ўяўленне пра абраную прафесію, дазваляюць лепш паглыбіцца ў атмасферу ВНУ.

— У Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі мы практыкуем таксама індывідуальныя кансультацыі, — паведаміла **Алена Куракіна**, рэктар, кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт. — Трапіць на іх можна па папярэднім запісе.

Курсы — платныя. На перыяд кароткатэрміновых ёсць магчымасць атрымаць месца ў інтэрнаце, але папярэдне трэба ўдакладніць гэтую інфармацыю непасрэдна ў ВНУ.

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў

рыхтуе спецыялістаў на факультэтах:
- *інфармацыйна-дакументных камунікацый,*
- *мастацкай культуры,*
- *музычнага і харэаграфічнага мастацтва,*
- *культуралогіі і сацыяльна-культурнай дзейнасці.*

Больш звестак для абітурыентаў



ПРА ІСПЫТЫ І ЛЬГОТЫ

Для паступлення ў творчыя навучальныя ўстановы абітурыенту належыць здаць не толькі цэнтралізаваныя экзамены ці тэсціраванне, але і ўнутраныя іспыты. Гэта датычыць большасці спецыяльнасцей.

— Варта не толькі запомніць па кавалачку прозы ці вершыку на беларускай і рускай мовах або ўрывак музычнай кампазіцыі. Неабходна, каб у скарбонцы абітурыента быў рэпертуар з твораў розных жанраў, і галоўнае, каб патэнцыйны студэнт змог умела скарыстаць яго, прадэманстраваўшы экзаменацыйнай камісіі свае найлепшыя якасці, — параіла Наталля Карчэўская.

Гэта сапраўды так, бо ад таго, наколькі рознабакова прэтэндэнт прэзентуе сябе на іспытах, можа залежаць адзнака і ў выніку — вучоба і кар'ера.

Нашы гледачы, якія падключыліся да эфіру, папрасілі ў спікераў настаўлення, як справіцца са страхам выступлення на экзамене.

— Насамрэч хваляванне — нармальная з'ява, — усміхнулася Алена Куракіна. — Думаеце, я, Наталля Уладзіміраўна, Іван Міхайлавіч не хвалюемся перад важным крокам? Галоўнае, мяркую, — паверыць у свае сілы і ісці да пастаўленай мэты.

Пры падачы дакументаў у прыёмную камісію варта прыкласці копіі ўзнагарод, уключаючы дыпломы лаўрэата рэспубліканскіх і міжнародных конкурсаў. Поўны спіс творчых спаборніцтваў, пераможцы якіх маюць права на залічэнне без іспытаў, размешчаны на сайце Міністэрства культуры ў раздзеле "Карысная інфармацыя".

— Звярніце ўвагу: гэты дакумент штогод абнаўляецца, — падкрэсліла Наталля Уладзіміраўна. — Таму лепш загадзя зверыцца, каб у апошні момант не стала прыкра праз уласную недальнабачнасць.

ПРА МЭТАВАЕ НАКІРАВАННЕ

— Не трэба разглядаць мэтавае накіраванне як гарантыю паступлення ў ВНУ, — папярэджвае абітурыентаў рэктар БДУКМ. — Яно проста дае магчымасць удзельнічаць у асобным конкурсе — сярод мэтавікоў.

Накіраванне карыснае яшчэ з той прычыны, што патэнцыйны студэнт дакладна ведае, дзе пры ўмове паступлення і паспяховага навучання будзе працаваць пасля выпуску. Таму можна скарэкціраваць выбар факультатываў у адпаведнасці з патрабаваннямі наймальніка.

Летась, дарэчы, у тры ВНУ па мэтавым накіраванні было залічана 40 студэнтаў.

Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі

навучае студэнтаў на факультэтах:
- *вакальна-харавым,*
- *аркестравым,*
- *фартэпіянным і кампазітарска-музыказнаўчым.*

Карысная інфармацыя для паступлення



— Колькасць такіх месцаў залежыць ад колькасці дасланых казчыкамі кадраў заявак. У нашым універсітэце ў гэтым годзе іх 37, — гаворыць Наталля Карчэўская.

Акадэмія музыкі ў 2026-м не плануе набор па мэтавым накіраванні.

— А ў нас сёлета пададзена дзве заяўкі ад заказчыкаў кадраў, — распавядае Андрэй Аніська. — Упэўнены, будзе забяспечаны конкурс, які пройдуць найлепшыя.

Самі абітурыенты ставяцца да мэтавага накіравання па-рознаму: нехта бачыць шанц пасапернічаць з адным канкрэтным прэтэндэнтам на тое ж месца, некаторыя падлічваюць да дзясятых долей магчымыя паказальнікі агульнага конкурсу.



выбар — прафесіі

набірае абароты. Выпускнікі школ з самых адказных крокаў у жыцці — дзе яны атрымаюць спецыяльнасць. і мастацтва" прайшло пасяджэнне Асаблівасці ўступнай кампаніі ў 2026 годзе".



ПРА БЫТ І КАМФОРТ

Істотная акалічнасць пры выбары ВНУ — умовы пражывання: цяжка засяродзіцца на творчасці альбо навуцы, калі не наладжаны быт. Прыемна адзначыць, што вышэйшыя навучальныя ўстановы сферы культуры забяспечваюць інтэрнатам усіх сваіх першакурснікаў.



— Умовы пражывання ў студэнтаў здавальняючыя: пакоі светлыя і цёплыя, абстаўлены ўсёй неабходнай мэбляй і тэхнікай, ёсць прастора для заняткаў і адпачынку. Такім чынам, бацькі могуць не хвалявацца, — супакойвае Наталля Уладзіміраўна.

Усім стандартам адпавядаюць пакоі інтэрнатаў абедзвюх акадэмій. Да таго ж у крокавай даступнасці — месцы, дзе за невялікія грошы можна добра падсілкавацца. І гэта таксама важна.

А яшчэ ў студэнтаў вельмі насычанае жыццё па-за лекцыямі і семінарамі. Размова не толькі пра падрыхтоўку да конкурсаў і непасрэдна выхады на сцэну. Ладзіцца багата падзей, прыдуманых самімі навучэнцамі і падтрыманых выкладчыкамі: квэсты і квізы, пастаноўкі, паездкі і сустрэчы.

— Але галоўнае — нашы студэнты, як, думаю, і студэнты акадэмій, могуць шырока самавыяўляцца, ім забяспечваецца творчая свабода. Пры гэтым яны абапіраюцца на практычную дапамогу прафесіяналаў, што вельмі каштоўна ў перыяд станаўлення, — упэўнена Наталля Карчэўская.

ПРА ПОПЫТ НА КАДРЫ

— Вяртаючыся да тэмы мэтавага накіравання, хачу сказаць, што яно вельмі актуальнае для працадаўцаў, — разважае рэктар БДУКМ. — Таму, што выпускнік гарантавана размяркуецца ў канкрэтную ўстанову, раён.

Яшчэ адна прычына, па словах Наталлі Уладзіміраўны, — сёння попыт на кваліфікаваных спецыялістаў у сферы культуры ў некалькі разоў большы за тую колькасць студэнтаў, што здольны падрыхтаваць ВНУ. І гэта тлумачыцца аб'ектыўнымі фактарамі.

— Спецыфіка творчых ВНУ такая, што часцей за ўсё вядзецца індывідуальнае навучанне, — тлумачыць Алена Куракіна. — Ва ўсялякім выпадку, у музыкантаў. І нават на тэарэтычных занятках групы невялікія — па некалькі чалавек. Адпаведна, і кошт навучання высокі, і якасць — належная.

— Індывідуальны падыход уласцівы падрыхтоўцы не толькі музыкантаў, але і студэнтаў іншых спецыяльнасцей — гукарэжысёраў, акцёраў, мастакоў і падобных, — дадае Андрэй Аніско.

— Варта памятаць і пра арыентаванасць навучання на практыку, — гаворыць Іван Паўлаў. — Большасць нашых студэнтаў з другога-трэцяга курса, а хто і раней, ужо спрабуе сілы ў розных цікавых тэлепраектах, у тым ліку на "Беларусьфільме".

Гэта і тэатральная пастаноўка "Снягуркі" ад першакурсніцы акадэміі, і конкурс маладых кампазітараў, і канцэрт харавых калектываў, і багата чаго іншага.

Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў

праводзіць падрыхтоўку на факультэтах:
- *кіно, тэатра і тэлебачання,*
- *мастацкім,*
- *дызайну і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва і інш.*

Інфармацыя для абітурыентаў





Івана Міхайлавіча падтрымалі рэктары. Так, да прыкладу, пры БДУКМ дзейнічаюць вучэбны тэатр, звыш 30 творчых калектываў. Студэнты Акадэміі музыкі выступаюць сольна і ў складзе ансамбляў на сцэнах Беларусі і замежжа. Можна згадаць той жа моладзевы ансамбль баяністаў і акардэаністаў, які летась падчас некалькіх канцэртаў на сталічных пляцоўках прыцягнуў шмат увагі, альбо штогадовы Велікодны фестываль. Сёлета ён быў насычаны разнастайнымі мерапрыемствамі, якія ладзіліся пераважна студэнтамі.

Сёння ВНУ нашай сферы рыхтуюць прафесіяналаў, якія годна прадстаўляюць Беларусь на міжнароднай арэне, фарміруючы станоўчы імідж краіны. Да таго ж выпускнікі Акадэміі мастацтваў, Акадэміі музыкі, БДУКМ — кожны на сваёй пасадзе, дзе б яны ні працавалі, — выхоўваюць у грамадзянах, і ў тым ліку ў новага пакалення, патрыятызм, гонар за Радзіму, годнасць, любоў да спадчыны і нацыянальных традыцый.

***

На відэаканферэнцыі, што доўжылася каля гадзіны, спікерам задалі шмат пытанняў. Самыя папулярныя трапілі ў гэты матэрыял. Больш пра ўступную кампанію — 2026 можна даведацца, паглядзеўшы запіс эфіру на нашым YouTube-канале.

Ірына СТАНКЕВІЧ
Фота Ангеліны САРОКІ, Уладзіміра ШЛАПАКА і з архіваў устаноў:

1. Наталля Карчэўская і Алена Куракіна.
2. Андрэй Аніско і Іван Паўлаў.
3. Падчас справаздачнага канцэрта на аркестравым факультэце ў Акадэміі музыкі.
4. Заняткі па харэаграфіі ў БДУКМ.
5. На мастацкім факультэце Акадэміі мастацтваў асвойваюць роспіс па абпаленай гліне.

Запіс відэаканферэнцыі